

«ФАКТАР.BY» ПАШЫРАЕ МЕЖЫ
5

ЧАГО КАШТУЕ ПЯДЗЯ ЗЯМЛІ?
13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

19 ЖНІЎНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 162 (29784)

КОРАТКА

● **Шосты мільён тон збожжа намалочаны ў Беларусі.**

● Дзяржсімвалы і выкананне гімна будуць абавязковымі атрыбутамі ўрачыстых мерапрыемстваў 1 верасня.

● **БЧ праводзіць акцыю «Дзеці і бяспека» з 22 жніўня да 4 верасня.**

● Новы чэмпіянат Беларусі па міні-футболе пачнецца 17 верасня.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей МІЦЯНСКІ, намеснік міністра эканомікі:**

*«Прадпрымальнікі гатовыя мяняцца ў цяперашніх умовах. Яны шукаюць новыя віды дзейнасці, каб замясціць замежныя кампаніі, якія раней пастаўлялі нам абсталяванне, сыравіну, матэрыялы. Пры гэтым дзяржава гатовая дапамагчы малому і сярэдняму бізнесу — з'яўляюцца новыя інструменты падтрымкі. Напрыклад, Беларускі фонд фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў арганізоўвае сустрэчы буйных прамысловых прадпрыемстваў з суб'ектамі малога і сярэдняга бізнесу, яны знаходзяць пункты для супрацоўніцтва, прадпрымальнікі ўбудоўваюцца ў кааперацыйныя ланцужкі з буйнымі вытворцамі. Пляцоўка для імпартазамяшчэння створана Беларускай універсальнай таварнай біржай, дзе гульцы рэальнага сектара эканомікі размяшчаюць свае заказы, звесткі аб сваёй прадукцыі. Ёсць пакет прапаноў для бізнесу і ў Банка развіцця. У першым паўгоддзі ў рамках рэгіянальных планаў па імпартазамяшчэнні суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва вырабілі прадукцыі на больш як $1,5 млрд. Думаю, бізнес будзе шукаць рэзервы для імпартазамяшчэння».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «СВАЁ, СВАЁ БЕЛАРУСКАЕ, І ЯШЧЭ РАЗ СВАЁ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ажыццявіў паездку ў Гродзенскую вобласць. Кіраўнік дзяржавы наведаў вытворчы кааператыў імя В. І. Крамко. Гаспадарка вядомая не толькі ў рэгіёне, але і ўвогуле ў краіне — адным словам, узорная. І гэта з першых хвілін свайго знаходжання на гродзенскай зямлі заўважыў беларускі лідар. Менавіта такой, па яго словах, павінна быць сельская гаспадарка ў нашай краіне.**



Фота БелТА.

Праўда, на адзін недахоп, які не схаваўся ад вопытнага вока кіраўніка дзяржавы, ён усё ж такі ўказаў: адстаюць у вытворчым кааператыве з уборкай саломы, адпаведна і з дыскаваннем глебы. Гэта, напэўна, адзінае, за што можна было пакрытыкаваць. Аднак Прэзідэнт не стаў. Гэта, як кажуць, не той выпадак.

### І людзі адказныя, і кіраўнікі моцныя

У цэлым беларускі лідар убачыў, што на тэрыторыі заходняй Беларусі зямля для пасеву азімых рыхтуецца. Якія тэмпы — справа іншая. Аляксандр Лукашэнка перакананы: гродзенцы пасеюць своечасова. Кажучы пра вытворчы кааператыў імя В. І. Крамко, Прэзідэнт не скупіўся на пахвалу: «І людзі тут адказныя, і кіраўнікі заўсёды былі тут моцныя».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што, падлятаючы сюды, ён успамінаў сярэдзіну 1990-х, калі развальўся Савецкі Саюз. Гродзенская вобласць у савецкія часы была найлепшай у СССР. Сюды прыязджалі і ў мясцовых спецыялістаў пераймалі вопыт. «Гродзеншчына была найлепшай ва ўсім Саюзе, — згадаў кіраўнік дзяржавы. — Я захапляўся вамі, як вы працуеце, і спрабаваў усё гэта (вопыт. — **Зв.**) перацягнуць туды, на самы-самы ўсход... І я вучыўся тут, у Гродзенскай вобласці». З развалам СССР рэгіён было не пазнаць, і найлепшая вобласць імгненна пераўтварылася ў найгоршую. Давялося прыводзіць рэгіён «да прытомнасці».

### Сялянам — жыллё, вытворцам — фірменны гандаль

Беларускі лідар пацікавіўся ў кіраўніка гаспадаркі Сяргея Крамко, які ў свой час пераняў эстафету кіравання вытворчым кааператывам ад свайго бацькі, ці актуальная для адной з найлепшых гаспадарак краіны праблема жылля. Пачуўшы, што яна, хоць і стаіць не востра, але ўсё ж такі ёсць, Прэзідэнт даручыў будаваць для працаўнікоў сяла арэндныя дамы. У сувязі з гэтым у найбліжэйшы час будзе разгледжана пытанне, як зрабіць таннейшым лес, які будзе выкарыстоўвацца для ўзвядзення дамоў у сельскай мясцовасці: «Самае дзіўнае — лесу мора, часам не паспяваем яго перапрацоўваць, а калі перапрацавалі, распілілі на дошку і вывезлі за мяжу: немцы робяць мэблю і ў нас яе прадаюць, напрыклад, або палякі. А нашы людзі павінны плаціць шалёныя грошы для таго, каб драўляныя дом пабудаваць». Прэзідэнт дадаў, што гэтыя дамы павінны быць арэнднымі. А то, як у нас часта бывае, чалавек пабудуецца за капейкі, а то і ўвогуле за бясплатна, а потым шукае іншае месца працы.

СТАР. 2

Жніво-2022: лідары

# УБОРАЧНЫ МАРАФОН МІКАЛАЯ ПРЫГОДЗІЧА

### Вопытны хлебароб першы на Гродзеншчыне перавысіў намалот у чатыры тысячы тон

**У арсенале камбайнера Мікалая ПРЫГОДЗІЧА з СВК імя Дзеншчыкова Гродзенскага раёна нямала працоўных узнагарод. У ліку самых памятных — новы аўтамабіль, ключы ад якога атрымаў ад кіраўніка дзяржавы. А летась за рэкордныя чатыры тысячы тон яму ўручылі пуцёўку ў санаторый. Які прыз чакае сёлета найлепшага камбайнера Гродзеншчыны? І ці будзе пабіты леташні рэкорд?**

СТАР. 3



Фота Мікалая ЛАПІНА.

Соцыум

# ЗАРОБКІ ПЕДАГОГАЎ, ПАДТРЫМКА МАЛАДЫХ І ПРЭСТЫЖ ПРАФЕСІІ

### На пленуме прафсаюза работнікаў адукацыі абмеркавалі надзённыя праблемы

**За шэсць месяцаў бягучага года прававымі інспектарамі працы Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі было арганізавана 46 прыёмаў, на якіх прынята 119 чалавек, разгледжаны 63 звароты, дадзена больш за 2,5 тысячы кансультацый.**

За першае паўгоддзе імі праведзены 75 праверак і 173 маніторынгі. Выяўлена і ліквідавана 955 парушэнняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб працы. Па патрабаванні прафсаюза яго членам было выплачана 374 602 рублі. Па просьбах работнікаў былі складзены 20 працэсуальных дакументаў, у тым ліку 11 — у судовыя органы, дзевяць заяў у камісію па працоўных спрэчках. З удзелам прафсаюза разгледжаны тры іскавыя заявы. 26 працоўных спрэчак былі вырашаны на карысць работніка без звароту ў суд. Тры чалавекі адноўлены на рабоце, у тым ліку адзін — праз суд. Гэтыя і іншыя лічбы агучыла на V пленуме Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі яго **старшыня Тацяна ЯКУБОВІЧ**. Яна падкрэсліла, што прафсаюзныя юрысты, як і раней, гатовыя бясплатна дапамагчы ў вырашэнні праблемы канкрэтнага чалавека.

### Увага — калектыўнаму дагавору

Апошнім часам прафсаюз ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам адукацыі працуе над прывядзеннем актаў заканадаўства ў адпаведнасць з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Усяго за першае паўгоддзе прафсаюзам разгледжаны 63 праекты.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

22162>

# «СВАЁ, СВАЁ БЕЛАРУСКАЕ, І ЯШЧЭ РАЗ СВАЁ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таксама кіраўнік вытворчага кааператыву Сяргей Крамко расказаў Прэзідэнту аб такой праблеме, як нерэнтабельнасць фірменнай прадукцыі. На балансе гаспадаркі — чатыры крамы з уласнай прадукцыяй, якую апошнім часам стала нявыгадна прадаваць. На гэты конт меркаванне ў Аляксандра Лукашэнкі адназначнае: «Такім гаспадаркам, якія маюць сваю перапрацоўку і гандаль, трэба даваць больш магчымасцяў». У прыватнасці, калі вытворчаму кааператыву патрэбны гандлёвыя пункты ў Мінску, дзяржава абавязкова падтрымае — канкрэтныя даручэнні ўжо дадзены кампетэнтным асобам. Аднак гэта абсалютна не азначае, што кожны можа разлічваць на падобныя прывілеі. «У нас сельская гаспадарка льгот мае дастаткова, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Як не кажы, але ўвага сельскай гаспадарцы ўдзяляецца вялікая. Цяпер сельская гаспадарка знаходзіцца ў больш выгадных умовах, чым прамысловасць. У сувязі з гэтымі санкцыямі і іншым».

Такім чынам, сельская гаспадарка ад дзяржавы атрымлівае шэраг прэферэнцый. Аднак, па словах Прэзідэнта, далей ільгатаваць сельскую гаспадарку небяспечна. Інакш — чакаць дысбалансу ў эканоміцы краіны.

## У прыярытэце — тэхналогіі

Падчас наведвання кіраўніком дзяржавы машыннага двара вытворчага кааператыву імя В. І. Крамко міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар Брыло далажыў аператыўную інфармацыю аб ходзе ўборачнай кампаніі. На сёння сабрана звыш шасці мільёнаў тон збожжа. Увогуле, прагноз добры. «Гэта залаты запас, — канстатаваў Прэзідэнт. — У будучыні не толькі малако, мяса, але і зерне, перш за ўсё збожжа, будзе мець прыстойную цану».

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік давёў Прэзідэнту актуальную інфармацыю па жніве ў рэгіёне. Па словах губернатара, на бягучы момант (на 18 жніўня) на тэрыторыі вобласці ўбрана 71 % плошчаў. «Завершана ўборка рапсу, — далажыў ён. — Атрымана рэкордная ўраджайнасць рапсу за ўсю гісторыю вырошчвання культуры. Па ўраджайнасці самы вялікі прырост атрыманы па азімым трыцікале, а таксама па яравым і азімым ячмені».

Чарговы раз кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на гэтай культуры і назваў усе перавагі вырошчвання азімага ячменю. Пры гэтым парэкамендаваў яго вырошчваць тым, каму зручна. «Я проста перавагі называю, не хачу, каб усе пад казырок узялі, — заўважыў Прэзідэнт. — Каб не падумалі, што я насаджаю гэтую культуру. У кожнай культуры ёсць мінусы. Так, ячмень больш далікатная культура, не заўсёды атрымаецца. Аднак атрымаецца, калі мы тэхналагічна правільна будзем да гэтага падыходзіць». І кіраўнік дзяржавы прывёў у прыклад уласны вопыт, калі ўраджайнасць гэтай культуры сёлета на эксперыментальных палях Прэзідэнта склала рэкордныя 74,2 цэнтнера з гектара. Каб дасягнуць такога высокага выніку, па яго словах, трэба выконваць тэхналогіі і падабраць добрае поле.



Фота БелТА.

Пры гэтым, аналізуючы ўборачную кампанію ў цэлым, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адчувае, як у добрым сэнсе «стогне» краіна — уборка ідзе напружана. Акрамя таго, Прэзідэнт паставіў задачу максімальна запоўніць сховішчы краіны плодаагароднінай прадукцыяй, каб у першую чаргу забяспечыць патрэбы ўнутранага рынку. «Мы павінны спажываць сваю бульбу, а не егіпецкую, — заўважыў ён. — Я нічога не маю супраць Егіпта. Але з Егіпта месяц трэба везці бульбу, вырашчаную ў цяпліцах».

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з новымі ўзорамі сельскагаспадарчай тэхнікі для інтэнсіўных тэхналогій апрацоўкі сельскагаспадарчых культур, якая знаходзіцца на балансе прадпрыемства. Таксама кіраўніку дзяржавы прадэманстравалі ўзоры сельгастэхнікі вытворчасці прадпрыемстваў Гродзеншчыны, распрацаванай у межах праграмы імпартазамяшчэння. Выснова такая: за гэтым будучыня.

Наведаў кіраўнік дзяржавы і фруктова-ягадны сад, дзе азнаёміўся з інтэнсіўнымі тэхналогіямі пры вырошчванні ягад і садавіны. У прыватнасці, сад абсталяваны сучаснай сістэмай паліву. У зямлі знаходзяцца датчыкі, якія нясуць інфармацыю аб вільготнасці глебы. Адпаведнае апавяшчэнне паступае галоўнаму аграному на мабільны тэлефон, і ён ажыццяўляе рэгуляванне інтэнсіўнага паліву.

Вядучы аграном-садавод вытворчага кааператыву імя В. І. Крамко Генрых Санько працуе ў гэтай сферы 29 гадоў. Каму, як не яму, адказваць на пытанні Прэзідэнта. Ужо ў размове з журналістамі вядучы аграном-садавод заўважае, што, каб дабіцца добрага ўраджаю тых жа яблыкаў, трэба выконваць усю тэхналогію вырошчвання: гэта і падбор сартоў, і сілкаванне, і абарона ад шкоднікаў, а таксама многае іншае. Адным словам, у гэтай гаспадарцы ёсць чаму павучыцца. Іх вопыт ужо запатрабаваны пры закладцы падобных садоў у іншых рэгіёнах краіны. Спецыялісты гатовы ім дзяліцца.

Паказалі Прэзідэнту і тое, як у гаспадарцы вырошчваюць сою. Пра рэнтабельнасць гэтай культуры развязалася дыскусія, галоўную выснову з якой зрабіў кіраўнік дзяржавы: трэба быць гатовым да заўтрашняга дня, а ў сувязі з гэтым чаму б і не эксперыментаваць.

## Вырошчваць сваё

Пасля дэталёвага знаёмства з магчымасцямі вытворчага кааператыву імя В. І. Крамко, Прэзідэнт правёў нараду па пытанні закладкі садоў і забеспячэння ўнутранага рынку садавінай і агароднінай. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што традыцыйна ў час уборачнай кампаніі розным напрамкам АП удзяляецца павышаная ўвага. У Квасоўцы ў цэнтры ўвагі — беларускія сады.

«Маё глыбокае перакананне: хлеб, мяса, малако, гародніна і, зразумела, садавіна, якая расце ў нас, на стале па максімуме павінны быць айчыннай вытворчасці. Сваё, сваё беларускае, і яшчэ раз сваё. І жыццё шматразова пацвярджала правільнасць такога падыходу», — упэўнены Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, нельга сядзець і чакаць, пакуль сюды прывязуць яблыкі з Польшчы ці Малдовы. Як паказвае час, можна і не дачакацца. Аляксандр Лукашэнка арыентуе на тое, што трэба вырошчваць самім. «І, як мы бачылі сёння, пры гаспадарскім падыходзе і выкананні тэхналогій гэта выдатна атрымліваецца. Прычым не толькі на Гродзеншчыне», — адзначыў ён.

Кіраўнік дзяржавы расказаў: яго пераконваюць у тым, што цудоўныя сады ёсць ва ўсіх рэгіёнах. Але іх відавочна не хапае. «З году ў год я даручаю ўраду і аблвыканкамам павялічыць плошчы закладкі прадукцыйных сартоў пладова-ягадных культур, патрабую адраджаць сады», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

У рамках Дзяржпраграмы «Аграрны бізнес» з рэспубліканскага бюджэту на названыя мэты пастаянна выдзяляюцца немалыя грошы. У прыватнасці, на 2022 год — каля 1,6 мільёна рублёў, аднак, тым не менш, плошча садоў штогод скарачаецца. «Але калі на скарочанай плошчы мы будзем вырошчваць у тры-чатыры разы прадукцыі больш — калі ласка. Але пакуль такога няма, таму трэба і на плошчы глядзець акуратна», — папярэдзіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы пацвердзіў свае словы лічбамі і фактамі. Таксама адзначаецца зніжэнне прадукцыйнасці садоў: напрыклад, за 2021 год у сярэднім па краіне ўраджайнасць пладоў і ягад склала 38,5 ц/га, што на 2 % менш у параўнанні з 2020 годам. У гэты ж час у сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках — 154 цэнтнеры з гектара. А гэта ў чатыры разы вышэй! Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, у чым справа. «Зразумела, што асобныя паўднёвыя сарты з-за кліматычных умоў не прыжываюцца. Але ў нас жа ёсць інстытут пладаводства і тры навуковыя ўстановы, якія займаюцца селекцыйнай работай, а таксама адаптацыяй замежных сартоў да нашых умоў», — нагадаў ён.

Паводле інфармацыі Нацыянальнай акадэміі навук, работа па стварэнні новых сартоў ідзе пастаянна. У дзяржаўны рэестр уключана амаль 150 найменняў, з іх трэць — яблыні. Усё гэта дазваляе ў поўным аб'ёме забяспечыць галіну пладаводства ўласным матэрыялам пладовых і ягадных культур.

«Акрамя таго, распрацаваны і тэхналагічныя рэгламенты апрацоўкі, проста іх толькі трэба выконваць! Мы пастаянна гаворым аб тым, што тэхналогіі ўсюды. А садоўніцтва ўвогуле не цярпіць парушэння тэхналогій. Там, калі нешта не зроблена, нічога цябе не выратуе. Людзі старэйшыя не маглі і ўявіць, што ў нашым клімаце будуць расці кавуны, дыні, персікі, буякі. А сёння — калі ласка. І на асабістых падворках, і ў фермерскіх гаспадарках. Трэба больш актыўна падцягвацца таксама вялікім сельгаспрадпрыемствам. Прыклад сёння бачылі, і ён не адзіны», — сказаў Прэзідэнт.

## Жыхары Беларусі з задавальненнем купяць айчыннае

Набліжаецца час уборкі пладоў. І калі ў канцы лета яблыкі каштуюць няшмат, дык зімой, а тым больш вясной, на іх зусім іншая цана. «Трэба толькі ўмець захаваць. І вы атрымаеце 150—200 працэнтаў рэнтабельнасці, ніякія вуглевадароды побач не стаялі. Зімовых сартоў у нас дастаткова. І жыхары Беларусі з задавальненнем купяць айчыннае па разумнай цане. А на пастаўках за мяжу мы можам добра зарабіць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз звярнуў увагу на важнасць айчыннай прадукцыі. Ён звярнуўся да ўсіх губернатараў. «Усё, што вырасціце і хочаце прадаць, павінна быць законтрактавана і прададзена, гэта значыць, дагаворы заключаны з гандлем. Не прададзена — грошы плаціць будзе той, хто не ўзяў або хто загубіў, калі ў сховішчы прадукцыя прападзе. Справядліва? Справядліва», — сказаў ён.

Прэзідэнт паставіў перад урадам канкрэтныя пытанні. Па-першае, якія меры прымаюцца па закладцы прадукцыйных садоў пладова-ягадных культур у краіне? Па-другое, як ідзе работа навукоўцаў па вывядзенні сучасных сартоў пладова-ягадных культур беларускай селекцыі і стварэнні тэхналогій у інтэнсіўным садоўніцтве? Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што гэта садоўнікі прадэманструюць яму на радзіме. Па-трэцяе, наколькі падрыхтаваны сховішчы для вырашчанага ўраджаю? Па-чацвёртае, які прагноз па аб'ёмах закладкі пладова-ягаднай прадукцыі на міжсезонне для ўнутранага спажывання, а таксама паставак на экспарт?

З дакладам аб развіцці садаводства ў краіне выступіў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар Брыло.

Пасля нарады Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з жыхарамі аграгарадка Квасоўка. Вяскоўцы сустрэлі кіраўніка дзяржавы на выхадзе з офіснага будынка вытворчага кааператыва. Большая частка жыхароў Квасоўкі працуе на прадпрыемстве. «Дзякуй вам! Малайцы! І вось тыя кіраўнікі, якія сёння былі, — гэта найлепшае, што ёсць у краіне. Лепш я нідзе не бачыў. І мы будзем рабіць усё, каб так было ўсюды», — сказаў Прэзідэнт.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Валерыя СЦЯЦКО.**
*Гродзенскі раён.*

### У тэму

## Нагода выйсці з зоны камфорту

Пасля нарады з Прэзідэнтам **віцэ-прэм'ер Леанід ЗАЯЦ** расказаў, як будзе вырашацца пытанне закладкі садоў і забеспячэння ўнутранага рынку садавінай. Ён падкрэсліў, што на радзіме Героя Беларусі Віталя Крамко паказана, як правільна інтэнсіўна развіваць сельскую гаспадарку.

«Прэзідэнтам была пастаўлена канкрэтная задача — у найбліжэйшую пяцігодку неабходна стварыць інтэнсіўныя сады ў краіне для таго, каб мы маглі вырабляць у сябе не менш за мільён тон пладовай прадукцыі. Тым больш мы бачым, што ідзе сур'ёзнае пацяпленне клімату і ў тых зонах, дзе раней па вызначэнні было немагчыма атрымліваць чарэшню, абрыкосы, ужо можна вырошчваць тыя культуры, якія раней мы завозілі па імпарце з Сярэдняй Азіі. Гэта пасільная задача, тым больш што ў нас напрацаваны практычны вопыт і ў фермерскіх гаспадарках, у нас ёсць свой інстытут харчавання, які ў Беларусі не проста захаваўся, але і развіўся. Маючы вопыт практычны і навуковы, нам неабходна зараз інвентарызаваць усе гаспадаркі нашай краіны. І ўжо на базе закладзеных садоў нам трэба дапрацаваць тэхналогіі, а менавіта кропельнае паліванне, з тым разлікам, каб атрымаць максімальную колькасць пладоў. Натуральна, інтэнсіўныя сады з абавязковым палівам. Упэўнены, што гэта дасць нам вельмі сур'ёзны прырост гэтай прадукцыі ў любое надвор'е», — расказаў Леанід Заяц.

**Старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Уладзімір КАРАНІК** падкрэсліў, што ўсе праблемы, якія ёсць у сельскай гаспадарцы вобласці, абсалютна вырашальныя. «Наша асноўная задача — гэта дыктатура тэхналогій, працоўная дысцыпліна. І дзяржава будзе падтрымліваць тых, хто добра працуе. Каб нашы гаспадаркі не проста былі нагодай для гонару, але яшчэ і забяспечвалі высокую эканамічную эфектыўнасць працы», — сказаў ён.

Губернатар падкрэсліў, што санкцыі — гэта дадатковы выклік, але гэта нагода многім работнікам выйсці са звыклай зоны камфорту і пачаць шукаць новыя лагістычныя ланцужкі, новыя рынкі збыту, новую запатрабаваную прадукцыю. «І тая тэхніка, якую мы паказалі і якая зроблена па праграме імпартазамяшчэння і запатрабавана сялом, мае добры экспартны патэнцыял. Гэтыя санкцыі прымусілі нас павялічваць працэс лакалізацыі», — заўважыў Уладзімір Каранік.

Жніво-2022: лідары

# НАМАЛАЦІЎ ЧАТЫРЫ ТЫСЯЧЫ!

**На Брэстчыне з'явіўся першы рэкардсмен-чатырохтысячнік. Андрэй КАБЯТКА з ААТ «Белавежскі» намалаціў чатыры тысячы тон збожжа. Журналісты яшчэ раней з сімпатыяй называлі яго «гэты няўрымслівы Кабятка», бо на сёлетнім жніве гэта не першы яго асабісты рэкорд.**

Павіншаваць Андрэя з працоўнай перамогай на мехдвор вёскі Мінкавічы Камянецкага раёна прыехалі кіраўнікі раёна і вобласці, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Механізатар у другім пакаленні быў крыху разгублены такой увагай і сказаў, што не планаваў ставіць рэкорды, проста працаваў, а так вось атрымалася.

Шчырыя словы падзякі адрасаваў хлебаробу **старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, сенатар Юрый НАРКЕВІЧ**:

— Першы ў раёне, першы ў вобласці, першы ў краіне! За сёлетнюю ўдарную работу дзякуем і жадаем далейшых поспехаў у жыцці, — сказаў Юрый Іосіфавіч. І дадаў: — Цяпер стараемся больш увагі ўдзяляць чалавеку працы, каб на прыкладзе такіх людзей выхоўваць маладое пакаленне.

На Брэстчыне, дарэчы, сабрана ўжо каля 95 працэнтаў збожжавых пры ўраджайнасці каля сарака цэнтнераў з гектара.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Фота з сайта газеты «Заря».

# УБОРАЧНЫ МАРАФОН МІКАЛАЯ ПРЫГОДЗІЧА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Сам рэкардсмен лічыць, што прыз — не галоўнае. Не дзеля ўзнагарод выходзіць штодзень у поле сапраўдны прафесіянал сваёй справы Мікалай Прыгодзіч. За яго плячыма — чвэрць стагоддзя працы на зямлі. Без пачуцця адданасці хлебнай ніве высокія вынікі наўрад ці атрымаеш. Так і ёсць. У Мікалая Прыгодзіча да зямлі свой падыход — гаспадарскі.

— Сёлета нямала палегліцы, таму жаць трэба вельмі акуратна, каб пазбегнуць страт. Вядома, трэба прыкладсці і сілы, і веды, і цярпенне. Бо не заўсёды ўдаецца выйсці з самага ранку з-за густой расы, трэба не спяшацца, а пачакаць, каб зерне не было занадта вільготным, — тлумачыць свой падыход да работы камбайнер.

Здаецца, лідар жніва прывык, што яго асобай цікавяцца журналісты, на пытанні рэагуе спакойна, часта ўсміхаецца. Чарговая планка спадара Прыгодзіча не застаецца без увагі. Адзначыць дасягненні камбайнера проста на поле прыязджаюць прадстаўнікі прафсаюзных арганізацый. Напрыклад, сёлета яму як першаму камбайнеру, які пераадолеў мяжу ў тры тысячы тон, уручылі дыплом пераможцы спаборніцтва і грашовую прэмію. Але галоўны прыз наперадзе. Перадавікоў жніва будуць урачыста віншаваць на раённых і абласных «Дажынках».

Мікалай Прыгодзіч другі год запар узначальвае спіс перадавікоў жніва Гродзеншчыны. Праўда, сам рэкардсмен кажа, што за ўласнымі вынікамі не сочыць. Тым не менш, разумее: дастойных сапернікаў у яго хапае.

**Старшыня Гродзенскага райкама прафсаюза работнікаў АПК Іван КРУПІЦА** паведаміў, што для заахвочвання механізатараў раённы прафсаюз выдзеліў больш за сем тысяч рублёў. На яго думку, гэта добры стымул для хлебаробаў. А высокая ўраджайнасць спрыяе і асабістым рэкордам.

Напрыклад, у СВК імя Дзеншчыкова збіраюць амаль 90 цэнтнераў з гектара. Летась паказчык быў значна ніжэйшы — 74,4 цэнтнера з гектара.

— Прырост салідны, — адзначае **старшыня СВК імя Дзеншчыкова Васіль СВІРЫД**. — Складнікаў такога поспеху некалькі. Паспрыяла добраму ўраджаю як надвор'е, так і зладжаная работа агранамічнай службы. І кадры, адпаведна, не падводзяць. Усё гэта дазваляе дабівацца высокіх вынікаў.

У СВК імя Дзеншчыкова збожжавы палетак — адзін з самых вялікіх у раёне. Усяго на жніве працуе 12 камбайнаў. Прастояў з-за паломак практычна няма, хоць сёлета гаспадарка сутыкнулася з праблемай набыцця запчастак на імпартныя камбайны. Але гэтыя пытанні ўдалося вырашыць. Адрамантавана і беларуская тэхніка, усе камбайны ўжо некалькі дзён таму намалацілі больш за тысячу тон зерня кожны, некаторыя камбайнеры дасягнулі і дзвюхтрох тысяч тон.

На адвозцы зерня задзейнічаны ўсе грузавікі, якія ёсць у гаспадарцы.

— Калі такі высокі ўраджай, тады і настрой падымаецца, хочацца хутчэй яго сабраць з поля. Таму кожны сонечны дзень выкарыстоўваем па максімуме, — кажа Мікалай Прыгодзіч. — Вядома, ад такога марафону ўжо крышку прытаміліся, але разумеем, што хутка фініш, і да яго трэба дайсці годна.

Як бы ні было цяжка, знакаміты камбайнер прызнаецца, што любіць сваю работу, а ненарміраваны рабочы дзень яго даўно не палохае. Мікалаю падабаецца жыць у сельскай мясцовасці, бо з дзяцінства прывык да работы на зямлі. Па бацькавых слядах пайшоў і сын — ён працуе на зернясушыльным комплексе. Таксама ў гаспадарцы працуюць жонка і брат перадавіка.

Ці будзе перасягнуты рубеж у пяць тысяч тон, пакуль сказаць цяжка. Уборка працягваецца, праўда, засталося зжаць яшчэ 10 % плошчы. Затое не падводзіць ураджай — рэкордны ў гаспадарцы.

Дарэчы, рэкордная ўраджайнасць сёлета і ў цэлым па Гродзенскім раёне. Сярэдняя ўраджайнасць складае 83 цэнтнеры з гектара. У некаторых гаспадарках намалот дасягае 100-102 цэнтнераў. У раёне чакаюць рэкордны валавы збор. Магчыма, яшчэ рана рабіць нейкія прагнозы, але ў раённым упраўленні сельскай гаспадаркі і харчавання спадзяюцца, што і сёлета раён па традыцыі будзе найлепшым у краіне па ўраджайнасці.

— У Гродзенскім раёне плануюць атрымаць 230 тысяч тон зерня, гэта самы высокі паказчык за ўсю гісторыю раёна. Хуткім тэмпам спрыяе высокая тэхнічная насычанасць гаспадарак. На ўзбраенні земляробаў сучасныя высокапрадукцыйныя камбайны, сваю аддачу далі фінансавыя рэсурсы, укладзеныя ў насенне, угнаенні, сродкі аховы раслін, — заўважыў **намеснік начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Гродзенскага райвыканкама Андрэй ЮХНЕЎСКІ.**

Хоць некаторыя гаспадаркі завяршылі ўборачную кампанію і правялі свае дажынкі, раёны вобласці працягваюць жніво. У цэлым па рэгіёне на 18 жніўня ўбрана 75 % плошчы. Ураджайнасць складае 52 цэнтнеры з гектара, гэта значна вышэй, чым летась.

Абласныя «Дажынкі» сёлета пройдуць 1 кастрычніка ў Вялікай Бераставіцы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 20 жніўня, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч ЛАБАДЗІНСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч КОЗЕЛ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Іван Іванавіч КУРМАН. Тэл. 8 015 273 56 44;
- старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Міхайлавіч ІСАЧАНКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;
- кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44

Надвор'е

# СПЯКОТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**У Беларусі ў найбліжэйшыя дні захаваецца спякотнае надвор'е. Тэмпература паветра на 4—7 градусаў перавышае сярэднія шматгадовыя значэнні. У сувязі з гарачым і сухім надвор'ем узрастае пагроза лясных пажараў, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У выхадныя дні на тэрыторыю Беларусі чакаецца паступленне няўстойлівай і вельмі цёплай паветранай масы з поўдня Еўропы, пры гэтым не абыдзецца без лакальных навальнічных дажджоў. У суботу, 20 жніўня, у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе 13—18 градусаў вышэй за нуль. Днём будзе 22—28 градусаў цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 30.

У нядзелю, 21 жніўня, у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—18 градусаў цяпла, днём — плюс 24—30.

Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, у пачатку працоўнага тыдня ў Беларусі захаваецца вельмі цёплае надвор'е з кароткачасовымі навальнічнымі дажджамі. У панядзелак—сераду, 22—24 жніўня, у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ночы складзе 13—20 градусаў вышэй за нуль. Днём будзе 24—31 градус цяпла, у паўднёвых раёнах — да плюс 33.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Швецыя на фоне росту цэн вярнулася да выкарыстання мазуту



На фоне рэкорднага падаражання газу скандынаўская краіна пачала актыўна выкарыстоўваць мазут для работы ТЭС. Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на Bloomberg. Паводле даных агенцтва, у краіне пачала рэгулярна працаваць цеплавая электрастанцыя Karlshamnsverket, якая выкарыстоўвае мазут. Пры гэтым адзначаецца, што звычайна ў Швецыі электрычнасць выпрацоўваецца за кошт АЭС, гідра- і ветраэлектрастанцый. Эксплуатацыя Karlshamnsverket прадугледжана толькі ў надзвычайных выпадках. Паводле звестак шведскага энергетычнага аператара Uniper SE, кошт электраэнергіі на поўдні Швецыі дасягнуў рэкордных паказчыкаў, падскочыўшы больш чым на 50 працэнтаў. У Uniper адзначылі, што з-за росту цэн на газ для генерацыі электрычнасці ўсё больш выкарыстоўваюцца нафтапрадукты, такія як мазут.

## У Венгрыі наймацнейшая за 100 гадоў засуха можа прывесці да праблем з пітной вадой



У краіне высахлі некаторыя азёры, а ўзровень вады ў рэках апусціўся да вельмі нізкіх адзнак. У тым ліку ён упаў і ў рацэ Ціса, ад якой залежыць колькасць пітной вады. У некаторых рэгіёнах Венгрыі пачалі папярэджваць насельніцтва аб зніжэнні напору вады і яе недахопу. Аб гэтым паведамляе газета Kronen Zeitung. Больш за ўсё складанасцяў у сувязі з засухай узнікла ў рэгіёне Пушта. Мясцовыя фермеры асцерагаюцца, што сёлета ўраджай пшаніцы будзе рэкордна нізкім. У цэлым урон ад засухі ў сельскай гаспадарцы можа скласці каля 20 мільярдаў долараў.

## Больш чым паўтысячы робатаў прадставяць на Сусветнай канферэнцыі робататэхнікі ў Пекіне



Звыш 500 робатаў будзе прадстаўлена на сёмай Сусветнай канферэнцыі робататэхнікі (World Robot Conference), якая праходзіць у Пекіне, паведаміла ТАСС. У выставе бярэ ўдзел больш чым 130 кітайскіх і замежных кампаній. Тут прадстаўлены гуманоіды, робаты-жывёліны, беспілотныя апараты, у тым ліку 30 мадэляў публіка ўбачыць упершыню. Сёлета асаблівая ўвага ўдзелена практычнаму прымяненню робататэхнікі ў такіх сферах, як медыцына, лагістыка, рэклама, сельская гаспадарка, будаўніцтва, вытворчасць, здабыўная прамысловасць. Як паведамілі арганізатары, будуць прадстаўлены ўстойлівыя да высокіх тэмператур робаты-пажарныя, хірургі, рабатызаванае абсталяванне для збору яблыкаў і іншых пладоў. Пытанні развіцця робататэхнікі абмяркуюць на форуме, які пройдзе ў вочным і аддаленым фармаце. Акрамя таго, адбудуцца штогадовыя спаборніцтвы, якія ў Кітаі называюць «Алімпіядай робатаў».

# ЗАРОБКІ ПЕДАГОГАЎ, ПАДТРЫМКА МАЛАДЫХ І ПРЭСТЫЖ ПРАФЕСІІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«І прафсаюз, і міністэрства зацікаўленыя ў павышэнні дабрабыту работнікаў галіны, — запэўніла Таццяна Якубовіч. — Ініцыіруючы ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у праекты заканадаўчых актаў, напрыклад, у інструкцыю аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў, «сотую» пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, тыпавыя штаты і нарматывы колькасці работнікаў установ адукацыі, мы разумеем, што ў сувязі з негатыўным уплывам санкцый у цэлым у цяперашні час ёсць пэўныя цяжкасці. У сувязі з гэтым на месцах неабходна ўдзяліць асаблівую ўвагу практычнай рэалізацыі Плана мерапрыемстваў, накіраваных на сацыяльную падтрымку работнікаў ва ўмовах санкцыйнага ціску на нашу краіну, які быў зацверджаны рашэннем прэзідыума Савета ФПБ у маі бягучага года: гэта паўната і своечасовасць выплаты заработнай платы, адпускных, працаўладкаванне вызваленых работнікаў у сувязі з аптымізацыяй галіны, аказанне матэрыяльнай дапамогі членам прафсаюза пры іх звальненні ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі і г. д. Санкцыі ўплываюць на ўзровень жыцця работнікаў і іх сем'яў. І мы павінны падтрымаць нашых членаў прафсаюза. У кожнай пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі створаны касы ўзаемадапамогі. Калі няма сродкаў у «пярвічцы», накіроўвайце заяву ў вышэйстаячую арганізацыю. **Наш прафсаюзны прынцып салідарнасці павінен спрацоўваць на 100 працэнтаў!** Прафсаюзнаму актыву на месцах неабходна сачыць за сітуацыяй вельмі ўважліва, каб рэальна бачыць і разумець, хто, дзе і ў якой дапамозе мае патрэбу. Трэба ўважліва ставіцца да запытаў людзей».

Таццяна Якубовіч праінфармавала, што шэраг ініцыятыў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ўвайшоў у дапрацаваны праект закона, які прадугледжвае змяненні адносна Працоўнага кодэкса, у тым ліку звязаныя з аплатай сацыяльных водпускаў, устанаўленнем выхаднога дня для праходжання дыспансерызацыі, які будзе работнікам аплачвацца.

«Адна з прыярытэтных задач прафсаюза — калектыўна-дагаворная работа: наяўнасць калектыўнага дагавора ў кожнай арганізацыі, яго ацэнка на прадмет адпаведнасці пагадненням больш высокага ўзроўню, сістэматычны аналіз выніказ яго выканання, недапушчальнасць выключэння з іх асобных нормаў. Увогуле якасць калектыўных дагавораў і пагадненняў павінна быць пад нашай пастаяннай увагай», — падкрэсліла старшыня галіновага прафсаюза. Яна канстатавала, што адзначаецца станоўчая тэндэнцыя па ўключэнні нормаў, якія паляпшаюць прававое становішча работнікаў — членаў прафсаюза ў параўнанні з заканадаўствам. Так, напрыклад, дадатковыя працоўныя і сацыяльна-эканамічныя гарантыі для моладзі прадугледжваюць 99,5 працэнта калектыўных дагавораў ад іх агульнай колькасці. Такая ж колькасць дагавораў прадугледжвае меры матэрыяльнага і маральнага стымулявання сем'яў да нараджэння дзяцей, адрасный сацыяльнай падтрымкі ветэранаў, якія не працуюць, пенсіянераў, удзелу наймальніка і прафсаюзнай арганізацыі ў змяншэнні кошту пуцёвак на санаторна-курортнае аздараўленне работнікаў арганізацый.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

> **«33 працэнты выпускнікоў профільных класаў выбіраюць педагагічныя спецыяльнасці, але ў рэгіянальных ВНУ ідзе недастатковая іх колькасць».**

Адзін з паказчыкаў прэстыжнасці галіны — узровень аплаты працы яе работнікаў. У бягучым годзе чатыры разы перагледжаўся памер базавай стаўкі, які прымяняецца для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый. З 1 мая ён складае 210 рублёў. З 1 студзеня ў два разы быў павялічаны памер аднаразовай выплаты на аздараўленне — як правіла, пры выхадзе ў працоўны водпуск. Настаўнікам, выкладчыкам, якія выконваюць функцыі класнага кіраўніка, куратарам вучэбнай групы ўстаноўлена надбаўка ў памеры 100 працэнтаў базавай стаўкі.

«Трэба адзначыць, што дасягнутыя змены пазітыўна адбіліся на суадносінах сярэдняй заработнай платы асобных катэгорый работнікаў галіны да сярэдняй па краіне. Так, па выніках студзеня — чэрвеня суадносіны сярэднямесячнай заработнай платы ў адукацыі склалі 70,5 працэнта да гэтага паказчыка па краіне (у 2021 годзе — 67,1 працэнта), у тым ліку ў педагагічных работнікаў — 82,3 працэнта (у 2021 годзе — 76,9 працэнта): у настаўнікаў — 89,6 працэнта (у 2021 годзе — 80,3 працэнта), у выхавальнікаў дашкольнай адукацыі — 63,1 працэнта (у 2021 годзе — 62,5 працэнта).

## Жыллёвае пытанне

**Старшыня Пухавіцкай раённай арганізацыі Беларускага прафсаюза адукацыі і навукі Таццяна ШАВЕЛЬ** падзялілася сваім бачаннем сітуацыі ў галіне і вопытам замацавання ў сістэме адукацыі маладых спецыялістаў:

— Падмуркам для рэалізацыі прынцыпу сацыяльнага партнёрства служаць пагадненне і калектыўны дагавор. Важна, калі яны маюць практычны характар і актуальны стан, а для гэтага патрабуецца карпатлівая праца, якая вымагае інтэлектуальных і часавых выдаткаў з боку кіраўнікоў і прафсаюзных лідараў.

Безумоўна, праблемнае поле заўсёды і ўсіх прымушае працаваць. Мы часта гаворым аб замацаванні педагагічных кадраў. У 2013 годзе гэты паказчык складаў у нас 38,5 працэнта. Дарэчы, гэта быў самы нізкі паказчык у Мінскай вобласці на працягу дзесяцігоддзя.

Сумесна пакрокава мы ўкаранялі новыя льготы, прэферэнцыі і гарантыі для маладых спецыялістаў. Ім, напрыклад, робіцца выплата да трох базавых велічынь пры прадстаўленні дагавора найму жылога памяшкання, аказваецца матэрыяльная дапамога на ўладкаванне. Сёлета 33 маладыя педагогі атрымліваюць такую кампенсацыю.

Як вынік, **з маладых спецыялістаў, якія прыбылі на работу ў Пухавіцкі раён у 2020 годзе, на сённяшні дзень працягваюць працаваць 91,7 працэнта.** Прыемна адзначыць, што 86,3 працэнта з іх — пухаўчане. Каб захаваць кадравы састаў, неабходна дайсці да кожнага чалавека, аказаць пасільную дапамогу і ў вырашэнні жыллёвага пытання. Падзялюся станоўчым вопытам. У 2013 годзе па ініцыятыве райкама прафсаюза ў нас быў створаны кааператыў «Настаўнік» і пабудаваны дом на 60 сем'яў. Важна адзначыць, што за час яго будаўніцтва ў кожнай другой сям'і нарадзілася дзіця.

Мы не стаім на месцы, узаемадзейнічаем з арганізацыямі і прадпрыемствамі раёна і выкарыстоўваем рэсурс інтэрнатаў. Так, у 2021 годзе 27 маладым спецыялістам па хадайніцтве ўпраўлення адукацыі і райкама прафсаюза былі выдзелены пакоі і блокі для пражывання ў інтэрнатах. Пра што часцей за ўсё гавораць людзі? Цытую: «Было б правільна адшукаць магчымасці льготнага крэдытавання для маладых спецыялістаў пры ўмове іх работы ва ўстановах адукацыі рэгіёнаў не менш за дзесяць гадоў. Але ў гэты тэрмін не павінен уключацца перыяд водпуску па доглядзе дзіцяці да трох гадоў». Заўважу, што сёння ў нашым раёне настаўнікаў матэматыкі, старэйшых за 55 гадоў, — 48,3 працэнта ад агульнай колькасці, а настаўнікаў фізікі, старэйшых за 55 гадоў, — 53,6 працэнта.

## Кадравае забеспячэнне галіны

Удзел у пленуме прафсаюза ўзяў **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ**, які спыніўся ў сваім выступленні на сацыяльна-эканамічных пытаннях і задачах, што стаяць перад галіной. Закранаючы тэму заробкаў у сістэме адукацыі, міністр канстатаваў, што найбольш вострым дадзенае пытанне з'яўляецца для выхавальнікаў установ дашкольнай адукацыі. Разам з Міністэрствам фінансаў вядзецца сур'ёзная работа ў гэтым напрамку. І магчыма, што да пачатку новага навучальнага года іх заробкі ўсё ж такі павысяцца...

Міністр падкрэсліў, што праграмай урада на перыяд да 2025 года прадугледжана павышэнне памеру аплаты працы педагагічных работнікаў да 100 працэнтаў ад сярэдняга заробку па краіне: у настаўнікаў — да 106 працэнтаў, а ў прафесарска-выкладчыцкага саставу — да 150 працэнтаў:

— Настаўнікі ўжо выйшлі на лічбу 89,6 працэнта ад сярэдняга заробку па краіне. У прафесарска-выкладчыцкага саставу цяпер 122 працэнты, а павінны выйсці на 150. Мы зможам дасягнуць гэты паказчык толькі нарошчваннем экспарту адукацыйных паслуг. Перад намі пастаўлена задача выканання экспарту на ўзроўні 103 працэнты ў параўнанні з папярэднім годам. Калі мы яе выканаем, то зможам выйсці на 135-140 працэнтаў ад сярэдняга заробку па краіне. Рэзервы бачым у развіцці дыстанцыйнага навучання, у першую чаргу, у магістратуры. Летась укараненне дыстанцыйных формаў навучання ў магістратуры дазволіла зарабіць дадаткова 17 мільёнаў долараў.

Асобна міністр спыніўся на праблеме кадравага забеспячэння галіны.

— За апошнія гады мы выйшлі на добрыя лічбы замацавання на першым рабочым месцы педагагічных кадраў пасля двухгадовай адпрацоўкі па размеркаванні (амаль 80 працэнтаў па краіне). Гэта сведчыць аб тым, што ўмовы, якія ствараюцца на першым рабочым месцы, адпавядаюць патрэбам маладых спецыялістаў. Але ў нас ёсць не толькі лідары (так, у Мінскай вобласці на працягу апошніх трох гадоў на першым рабочым месцы застаецца больш за 90 працэнтаў маладых педагогаў), але і антылідары. У сталіцы гэты паказчык складае ўсяго 62 працэнты. А куды сыходзяць яшчэ амаль 40 працэнтаў выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў? Добра, калі ў іншую ўстанову адукацыі, а не ўвогуле з галіны. Я быў сёлета на размеркаванні настаўнікаў пачатковай адукацыі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце, цікавіўся, чаму мінчане і жыхары абласных цэнтраў выбіраюць для размеркавання райцэнтры? Высветлілася, што дзяўчаты едуць услед за мужам, напрыклад, калі той — ваенны. Заўважу, што 30 працэнтаў выпускнікоў педуніверсітэта на момант заканчэння навучання ўжо звязаныя сямейнымі вузамі (між іншым, у медыцынскіх універсітэтах гэты паказчык складае ўсяго 1-3 працэнты). Дык давайце праводзіць больш сумесных мерапрыемстваў паміж педуніверсітэтам і ВНУ сілавых ведамстваў, — пажартаваў міністр. — І сем'і будуць больш актыўна ствараюцца, і рэгіёны атрымаюць дэфіцытных спецыялістаў — усім карысць. А сямейны педагог будзе прапагандаваць у школе не толькі нацыянальныя, але і сямейныя каштоўнасці...

Андрэй Іванец праінфармаваў, што ўжо **распрацавана дарожная карта па ўдасканаленні дзейнасці педагагічных класаў.** «Цяпер 33 працэнты выпускнікоў профільных класаў выбіраюць педагагічныя спецыяльнасці, але ў рэгіянальныя ВНУ ідзе недастатковая іх колькасць. Таму, пакуль педкласы ў рэгіёнах будуць працаваць ухаластую або толькі на Мінск, яны не дачакаюцца маладых спецыялістаў. Упэўнены, што ў нашай краіне створаны ўсе ўмовы для эфектыўнай работы педагагічных класаў. А ў наступным навучальным годзе адкрыюцца новыя магчымасці. Ужо падрыхтаваны праект Палажэння аб правядзенні ўніверсітэцкіх алімпіяд, пераможцы якіх змогуць паступаць у ВНУ, якая праводзіла алімпіяду, без экзаменаў. Пад іх адводзіцца да 15 працэнтаў ад кантрольных лічбаў набору ў ВНУ. А для вostра запатрабаваных спецыяльнасцяў мы ўвогуле такія абмежаванні не будзем устанаўліваць. І калі рэгіёну патрэбныя, напрыклад, настаўнікі фізікі, матэматыкі, — не ўпускайце такую магчымасць», — заўважыў міністр.

Дарэчы, у наступным навучальным годзе пройдзе першы Рэспубліканскі фестываль-конкурс «Педагагічны дэбют», накіраваны на выяўленне і падтрымку маладых таленавітых педработнікаў. Ён будзе праходзіць у чатырох намінацыях: «Малады дырэктар установы агульнай сярэдняй адукацыі», «Малады загадчык установы дашкольнай адукацыі», «Малады настаўнік» і «Малады выхавальнік установы дашкольнай адукацыі». Удзельнічаць у ім змогуць маладыя педагогі ва ўзросце да 31 года са стажам работы на пасадзе не больш як пяць гадоў.

І яшчэ адну магчымасць анансаваў Андрэй Іванец. Ён паведаміў, што ў БДПУ сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі быў распрацаваны дыстанцыйны гадавы курс павышэння кваліфікацыі, разлічаны на выпускнікоў непедагагічных спецыяльнасцяў, якія прыйшлі працаваць у сістэму адукацыі. Каб тыя без адрыву ад асноўнай дзейнасці маглі атрымаць педагагічны складнік і тыя веды, якіх ім не хапае, а пазней ва ўстаноўленым парадку павышаць сваю кваліфікацыю. Дырэктар, што прыняў на работу, напрыклад, выпускніка хімфака ці біяфака, зможа накіраваць заяўку ў Акадэмію паслядыпломнай адукацыі з хадайніцтвам прыняць работніка яго арганізацыі на дыстанцыйны курс. Навучанне будзе бясплатным, але з такім работнікам будзе заключацца кантракт на пэўны тэрмін, які стане гарантыяй, што той, адвучыўшыся, не сыдзе... Не сакрэт, што сёння хапае людзей з дыпломам аб педагагічнай адукацыі і шчырым нежаданнем працаваць у школе. Але ёсць і зусім іншыя прыклады, якія натхняюць, бо наяўнасць дыплома ў рабоце з дзецьмі — насамрэч, зусім не галоўнае...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

З нагоды

# «ФАКТАР.BY» ПАШЫРАЕ МЕЖЫ

**На старонках «Звязды» ўжо з'яўлялася навіна аб правядзенні кастынгаў на шоу «Фактар.by». Апошні шанц трапіць на конкурс будзе 21 жніўня ў канцэртнай зале «Мінск». Але арганізатары падрыхтавалі яшчэ адзін сюрпрыз як для гледачоў, так і для канкурсантаў. Прэс-служба Белтэлерадыёкампаніі паведаміла аб прыёме заявак на ўдзел у праекце «Фактар.by 60+».**

Першыя дні праслухоўванняў прыцягнулі ўвагу не толькі таленавітай моладзі з усіх куточкаў краіны, але і тых, хто шмат гадоў жыве з песняй у сэрцы. Пасля сустрэчы з вялікай колькасцю яскравых выканаўцаў паважнага ўзросту творчая група праекта вырашыла пашырыць музычнае шоу самастойным інклюзіўным дапаўненнем з прыстаўкай «60+», які выйдзе на канале «Беларусь 1» у пачатку 2023 года адразу пасля заканчэння асноўнага конкурсу.

Арганізатары запрашаюць таленавітых і маладых душой удзельнікаў паспрабаваць свае сілы ў праекце. Як адзначаюць аўтары ідэі, «Фактар.by 60+» — гэта вакальнае шоу, якое дакажа, што ўсе ўзросты пакорныя сцэне, а пашпартныя даныя не з'яўляюцца нагодай, каб адмовіцца ад жадання спяваць.

Плануецца, што шоу атрымаецца сапраўды душэўным і сямейным. Але ўмовы ў канкурсантаў «Фактар.by 60+» будуць такімі ж, як і ва ўдзельнікаў асноўнага конкурсу. Сталыя спевакі будуць выступаць на высокатэхналагічнай сцэне, што размясцілася ў павільёне найбуйнейшай кінастудыі краіны. Выканаўцаў чакаюць каментарыі ад зорных настаўнікаў, а гледачы, у сваю чаргу, атрымаюць асалоду ад легендарных песень на ўсе часы.

Прыём заявак на ўдзел у праекце ўжо адкрыты. Белтэлерадыёкампанія прапануе гледачам на працягу паўтара месяца дапамагчы сваім бацькам, бабулям і дзядулям запоўніць анкету на сайце Белтэлерадыёкампаніі, каб тыя маглі стаць часткай вялікай і дружнай музычнай сям'і «Фактар.by».

**Арына КАРПОВІЧ.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 172

Першыя дзве пазіцыі даслаў Віктар Шульга (Мінск).

**№ 113**



**№ 113**

**Белыя простыя:** e1, a5, c5, e5, g5, d6, h6, e7 (8)

**Чорныя дамкі:** f2, h2, c3, e3, g3, f4, a7 (7)

**№ 114**

**Белыя простыя:** c1, b2, d2, h2, c3, g3, f4, a5 (8)

